УДК 947.6(=411.6) «1914/1916»

# ЛАГІШЫНСКАЯ АПЕРАЦЫЯ І ПОДЗВІГ РЫМЫ ІВАНОВАЙ

**М.В. Цуба**
Палескі дзяржаўны ўніверсітэт, cubanm05@rambler.ru

Сёлета споўніліся 100–я ўгодкі з пачатку Першай сусветнай вайны (1 жніўня 1914г.). Не дзіўна, што да яе падзей у тым ліку, якія адбываліся на Піншчыне, назіраецца павышаная увага.

Шмат артыкулаў прысвечана міласэрнай сястры Рыме Івановай, пасмяротна ўзнагароджанай імператарам Расіі Мікалаем II за мужнасць і ахвярнасць афіцэрскім ордэнам Св. Георгія IV ступені. Аднак па–ранейшаму ў публікацыях аб яе дзейнасці прыводзяцца некаторыя супярэчлівыя дадзеныя.

Адны аўтары лічаць, што Рыма Іванова загінула непадалёку ад вёскі Дабраслаўка, другія – каля вёскі Мокрая Дубрава. Хтосьці піша, што яна служыла ў 77–ай дывізіі, хтосьці – у 27–ай. Сур'ёзнай памылкай з'яўляецца прыпіска германскага наступлення на паўднёвых беларускіх землях да вядомага Свянцянскага прарыву, што адбыўся на паўночным захадзе Беларусі. Прысутнічае таксама блытаніна ў передыслакацыі пазіцый войск у ходзе трохдзённых баёў пад Лагішынам і г. д.

А ўсе гэтыя факты павінны мець выключную дакладнасць у сувязі з мерапрыемствамі па ўвекавечванню памяці славутай расійскай гераіні Рымы Міхайлаўны Івановай.

Неабходна правільна ўстанавіць месца яе ранення і смерці, што прывядзе к дакладнасці пастаноўкі помніка і надпісу на ім.

У маёй кніжцы "Першая сусветная вайна на Беларусі ў кантэксце сусветных ваенных падзей (грамадскі і ваенныя бакі) 1914–1918гг."[1], распавядаецца аб подзвігу Рымы Івановай. Аднак вялікая тэматыка даследавання не дазволіла дэталізаваць падзеі, што адбываліся пад Лагішынам. Тым не менш, быў надрукаваны архіўны картаграфічны матэрыял. Па дакладных картах і загадах камандавання можна добра разабрацца ў сітуацыі.

Такім чынам наспяванне Лагішынскай аперацыі адбывалася ў наступным накірунку: паралельна Свянцянскаму прарыву, які праходзіў на паўночна–заходняй частцы беларускіх земляў, на поўдні Беларусі наносіўся ўдар новастворанай Бужскай арміяй на чале з генералам Лінзінгенам (дадзеная армія была створана на аснове расфарміраванай 11–й германскай арміі). Менавіта, гэтая армія напрацягу ліпеня–жніўня 1915 года змагла з баямі, цеснячы адступаючыя расійскія войскі, прайсці даволі значную тэрыторыю ад Брэст–Літоўска да Пінска[2, с.43].

31–шы армейскі корпус пад камандаваннем П.І. Мішчанкі, які ўваходзіў у склад 3–й арміі Л.В. Леша, пасля доўгага адступлення заняў даволі трывалыя і выгадныя пазіцыі на рацэ Ясельда і Агінскім канале. Але канчаткова замацавацца на гэтай мяжы корпусу перашкодзіў не наступаючы праціўнік у выглядзе 41–га германскага корпуса Бужскай арміі, а загад камандуючага 3–й арміі генерала Леша. Менавіта празмерна асцярожны Леш аддаў загад аб адводзе 31–га корпуса далей на ўсход на 10–16 км. на сумніўныя пазіцыі на лініі р. Вісліца, Пагост, Вылазы. Камандаванне Заходняга фронту на чале з генералам Эвертам выразіла крайнее незадавальненне такім рашэннем камандуючага 3–й арміі. У сувязі з чым, генерал Леш адсылае новае распараджэнне у штаб 31–га армейскага корпуса, які толькі што распалажыўся ў мястэчку Лунін, аб вяртанні на ранейшыя пазіцыі[3]. Прасцей гэтую задачу можна было вырашыць у раёне Пінска, так як П.І. Мішчанка па асабістай ініцыятыве аставіў ар'ергард 83–й пяхотнай дывізіі на камандных вышынях па р. Ясельда каля мястэчка Гарадзішча. Іншае становішча складвалася у раёне Лагішына, дзе ўжо адбыўся поўны адвод расійскіх войск і адпаведна дадзеная тэрыторыя была занятая кайзераўскімі войскамі. Гэта і прывяло да правядзення аперацыі, галоўнай мэтай якой было ўсталявацца на лініі Агінскага канала, разграміўшы па ходу істотную групоўку кайзераўскіх войск у Лагішыне. У гэты час у склад 31–га корпуса ўваходзілі: 27–я, 75–я, 77–я пяхотныя дывізіі.

З пачатку ваенных дзеянняў (8 верасня 1915 г.) штаб 27–й дывізіі знаходзіўся ў в. Дабраслаўка, 75–й у в. Новы Двор, а 77–й у в. Чухава[4, с.17].

Напярэдадні наступлення чытаем загад генерала П.І.Мішчанкі ад 6 верасня 1915 года ў штаб 77–й дывізіі генералу Штэгельману: "У сувязі з малой канцэнтрацыяй войск на фронце наступлення 27–й дывізіі, прашу неадкладна на час аперацыі, перадаць найбольш баяздольны

ПолесГУ

105 полк у распараджэнне штаба гэтай дывізіі”[5]. Такім чынам, 105–ы пяхотны Арэнбургскі полк 77 дывізіі, перайшоў у часовае падпарадкаванне штаба 27–й дывізіі. З пачаткам аперацыі 8 верасня гэты полк згодна з картай, выступіў з Дабраслаўкі і па прамым шляху дайшоў да хутара Ільяшоўка, дзе пераадолеў незначнае супраціўленне ворага. Але , менавіта ў Ільяшоўцы, полк падзяліўся пабатальённа, у кожным батальёне было па 4 роты. Батальёны разышліся кожны па свайму маршруту, выконваючы пастаўленыя перад імі задачы. Аднак нас цікавіць далейшы рух наперад  3–га батальёна 105–га палка ў які ўваходзіла 10–я рота Рымы Івановай. З Ільяшоўкі гэты батальён адразу накіроўваецца на поўдзень і з баямі авалодвае вёскай Аляксандраўка. Затым разам з падыйшоўшым сюды 3–м батальёнам 108–га палка праводзіць атаку на добра ўмацаваныя пазіцыі немцаў у раёне фальварка Юзефін. Але рэагуючы на моцны агонь германскай артылерыі паварочвае ў бок вёскі Лышча і атакуе ў гэтай вёсцы паўднёвую акраіну нямецкай абароны. Тым самым дапамагае развіць атаку ў цэнтральным напрамку дадзенай вёскі 1–му батальёну свайго 105–га палка. Па зводцы ў сярэдзіне дня 8 верасня ў раёне в.Лышча і ф. Юзефін у ходзе наступлення былі найбольшыя страты – 340 забітых, але ўсе ж расійскія войскі змаглі авалодаць першай лініяй абароны праціўніка. У выніку пасля першага дня боя, у ходзе Лагішынскай аперацыі,  расійскія войскі выйшлі на аператыўную лінію Забараўцы–Лышча–Юзефін–Надатынь–Сташаны[1, с.136].

На самым золку раніцы, пад пакровам цемры 9 верасня распачалася артпадрыхтоўка па германскіх пазіцыях. Пасля чаго расійскія войскі перайшлі ў атаку. Бой за Лышча прыняў упарты, бязлітасны характар. 3–ці батальён нёс вялікія страты. Падчас чарговай атакі камандзір 10 роты і яго намеснік былі забіты. Рота пачала адступаць, але насустрач адступаючым, спыніўшы перавязку на полі боя,  кінулася міласэрная сястра Рыма Іванова. Яна сабрала вакол сябе ўсіх тых, хто мог трымаць зброю і павяла за сабой у атаку з крыкам “Наперад! За мною!” У выніку натхнёныя такім паваротам падзей салдаты змаглі адкінуць ворага і авалодаць нямецкімі акопамі, тым самым вызваліўшы вёску. Аднак Рыма Іванова, пры гэтым, была цяжка паранена ў бядро. Вядома, што яе вынеслі з поля боя, перавязалі, даставілі ў суседнюю вёску Дабраслаўку, дзе ў санчасці працаваў доктарам яе брат Уладзімір. Яна хацела жыць і верыла, што брат яе выратуе ад смерці. Але ў палявых умовах, пры вялікай страце крыві спасці яе было немагчыма. Як адна з крыніц паведамляе: “Она долго мучилась и уже знала, что умирает. Перекрестила обступивших её рыдающих солдат. Последнее, что прошептала, было: «Боже, спаси Россию»”[6, с.23].

Але не толькі дадзеным подзвігам знакаміта Рыма Іванова. Вядома, што за час службы на фронце яна змагла вынесці з поля боя каля 600 параненых расійскіх салдат[6, с.22].

Рыму Іванову пахавалі ў родным Стаўрапалі, каля Андрэяўскага кафедральнага сабора, дзе хавалі мясцовых герояў. А стаўрапальскія светары паднялі пытанне аб прылічэнні дзяўчыны да ліку святых. Але ў савецкі час могілкі былі знесены, а на прыкладным месцы магілы шматпакутнай Рымы Івановай быў зроблены грамадскі туалет[6, с.23]. Толькі зусім нядаўна з’явіўся сціплы помнік.

Але ж дзе паставіць помнік на Піншчыне, які б увекавечыў памяць Рымы Івановай?

1) У некаторай ступені гэта можна зрабіць у в. Лышча, тут яна была паранена, праліла кроў.

2) Найбольш падыходзячым аб’ектам для гэтага з’яўляецца в. Дабраслаўка. Тут Рыма Іванова ад раны памерла, тут была адпетая ў царкве, адсюль ляжаў яе апошні шлях на радзіму ў Стаўрапаль.

3) Мэтай аперацыі расійскіх войск, за якую Рыма Іванова аддала жыццё, быў разгром праціўніка ў Лагішыне, вызваленне горада і замацаванне на выгадных пазіцыях па Агінскаму каналу, г.зн. сюды мы можам прылічыць і горад Лагішын.

Што датычыцца в. Мокрая Дубрава, згодна з картай, 3–ці батальён разам з 10–й ротай, якія панеслі вялікія страты пры ўзяцці в.Лышча, адразу разам з параненай Рымай Івановай  быў адведзены ў тыл і далей гэтай вёскі наперад не рухаўся, а гэта значыць, увогуле не ўдзельнічаў у дальнейшым наступленні ў накірунку на Мокрую Дубраву. З усяго 105–га палка ў баях за Мокрую Дубраву ўдзельнічаў толькі 1–шы батальён 105–га палка. Гэта добра адлюстравана на карце[1, с.140–142].

Для таго, каб усё адпавядала рэчаіснасці, на мой погляд было б разумным прымацаваць шыльдачку на сцяне Свята–Троіцкай царквы ў в. Дабраслаўка, прыкладна з такім надпісам: “09.10.1915г. Р.М. Іванова падчас аперацыі па вызваленню Лагішына ўзначаліла пераможную атаку расійскіх войск, у ходзе якой была цяжка паранена каля в. Лышча, памерла ад раны у в. Дабраслаўка і была адпетая ў мясцовай Свята–Троіцкай царкве”.



ПолесГУ

Падобны змест тэкста патрэбна нанесці і на помнік, які на маю думку можна паставіць (улічваючы ўжо мною адзначаныя факты і турыстычную складаючую) у г. Лагішын.

Можна дабавіць да тэксту на помніку і словы  непасрэдна самой Рымы Івановай, узятыя з яе франтавых пісьмаў, з нашай мясцовасці да бацькоў. Прываджу некаторыя ўрыўкі з пісьмаў сапраўднай расійскай патрыёткі: «Несу обязанности фельдшера…Обед здесь и солдатский очень вкусный. О тепле – располагаемся в крестьянских избушках. О переходах. Умею и люблю много ходить… Вернусь к вам здоровая и удовлетворенная. Ведь так приятно сознавать, что в этом большом деле приносишь пользу. Опасность далеко от меня, ее нет…». У іншым пісьме яна пісала: «Господи, как хотелось бы, чтобы вы поуспокоились. Да пора бы уже. Вы должны радоваться, если любите меня, что мне удалось устроиться и работать там, где я хотела… Но ведь не для шутки я это сделала и не для собственного удовольствия, а для того, чтобы помочь. Да дайте же мне быть истинной сестрой милосердия. Дайте мне делать то, что хорошо, и что нужно делать. Думайте, как хотите, но даю вам честное слово, что многое–многое отдала бы я для того, чтобы облегчить страдания тех, которые проливают кровь. Но вы не беспокойтесь: наш перевязочный пункт не подвергается обстрелу… Мои хорошие, не беспокойтесь, ради Бога… Жизнь вообще коротка, надо прожить ее как можно полнее и лучше. Помоги, Господи! Молитесь за Россию и человечество…»[6, с.22–23].

Дарэчы, маштабы Лагішынскай наступальнай аперацыі дазваляюць увекавечыць і іншыя мясціны на Піншчыне, звязаныя з яе падзеямі.

***Спіс выкарыстанных крыніц:***

1. Цуба, М.В. Першая сусветная вайна на Беларусі ў кантэксце сусветных ваенных падзей (грамадскі і ваенны бакі) 1914 – 1918 гг.: Манаграфія / М. В. Цуба. – Пінск : ПалесДУ, 2010. – 304 с.

2. Мировая война в отдельных операциях. Бои на реке Зап. Буге летом 1915 года / Обработано по данным Германского генерального штаба в 1917 году капитаном Пэльманом.  – Петербург: Госиздат., 1921. – 57 с.

3. Савченко, М. Бои под Логишином в 1915 году / М. Савченко // Полесская правда. – 1984. – 6 окт.

4. Меньчуков, Е.А. Бои под Логишином в 1915 году / Е.А. Меньчуков. – Москва: Гос.воен.изд., 1937. – 75 с.

5. ЦВГА РФ. – С. 142. – Л. 486.

6. Великая и забытая: военно–исторический православный календарь 2014. – М. : Издательство “Николин день”, 2013. – 352 с.

Полесгу